ідэя «паралельнага ўздзеяння» А.С.Макаранкі. Адной з зыходных ідэй М.П.Шчацініна было атаясамліванне музычнага выхавання і выхавання ў цэлым, калі сталі відавочнымі ўзаемасувязі гэтых з'яў.

Пры дыягностыцы творчага патэнцыялу асобы студэнта намі выкарыстоўвалася методыка тэставага тыпу для дыягностыкі ўзроўню сфарміраванасці дыялектычных разумовых дзеянняў. На аснове атрыманых даных студэнты падзяляюцца на тры ўзроўневыя групы ў адносінах да кожнай састаўляючай. У працэсе даследавання не былі выяўлены асобы, якія валодалі б адначасова высокай сфарміраванасцю дыялектычнага мыслення і нізкім узроўнем творчых патрэбнасцей, што дапускае антагенетычна зыходны характар апошняй.

Разам з тым узяты асобна параметр выяўленасці творчых патрэбнасцей не дэманструе значных карэляцый з паказальнікамі эфектыўнасці навуковай дзейнасці, у той час як узровень сфарміраванасці дыялектычнага мыслення значна карэлюе з працэсуальнымі паказальнікамі эфектыўнасці, паказальнікамі ўзроўню валодання сродкамі арганізацыі навуковай дзейнасці (у прыватнасці аналітычнымі уменнямі), паказальнікамі ўзроўню самааналізу і самакарэкцыі.

Найвышэйшы ўзровень эфектыўнасці дэманструюць асобы з высокім узроўнем развіцця абедзвюх састаўляючых, патрэбнасці ў пошуку, пераўтварэнні і сфарміраванасці разумовых дзеянняў. Адзначым, што для іх характэрны прамежкавыя (эмацыйна-метадычны і разважальна-імправізацыйны) стылі навуковай дзейнасці.

Асобы з нізкім узроўнем сфарміраванасці абедзвюх састаўляючых дэманструюць, як правіла, тэндэнцыі да пэўнага стылю навукова-даследчай дзейнасці. Адначасова яны дэманструюць самыя нізкія паказальнікі яе эфектыўнасці.

Негатыўныя сацыяльна-псіхалагічныя праявы ў найбольшай ступені характэрны для асоб з высокім узроўнем выяўленасці творчай патрэбнасці пры адначасовым нізкім узроўні сфарміраванасці дыялектычнага мыслення.

Гэтыя думкі ляглі ў аснову арганізацыі навукова-даследчай і вучэбна-даследчай работы студэнтаў на факультэце беларускай філалогіі і культуры.

**Дональд Р.Хорвард,**
прафесар

## ACTIVISATION OF CREATIVE ABILITIES IN LUDIVıDUAL STUDENTS FOR 21ST CENTURY EDUCATIONAL REFORM

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

I. «21st Century Educational Reform through academic diagnosis and prescription. Each chid is an individual with learning needs-thus purpose for the school. Traditional education begins with the state and its responsibility to teach. It focuses on teaching subjest for the benefit of the state and cultural institution. Educational Reform focuses, on the needs of the learner, the learning experience, and the process of learning. All subject matter begins, not with the teacher and teaching, but with the learner and learning. How does a child learn and how can we help children to learn for the benefit of the learner and his individual ultimate success? Global Educational Reform focuses on the child and how he assumes the responsibility for learning, the tools that facilitate the learning process, and how the material to be learned is designed and developed into a continuous progress-high technology curriculum with a learning format. Another major fucus is on how the child is controlled and motivated throung a system of learning center procedures combined with a plan for pupil-teacher interaction, and a curriculum with text interaction, learning response, and practical reward adequate to the end objective of learning. These are built into the system to provide incentive, measurable achievement, and fulfillment.

II. «...21st Century Education Reform through the application of the individual and high technology.» The conventional classroom, teacher, chalkboard and textbook was introduced by Prussia in the 1800s. It is now as out

of date as the horse and buggy. 21st Century Educational Reform will feature a learning center where the teacher serves as a guide and facilitator to the child's individualized learning experience and where modern hight tech curriculum replaces a textbook, workbook version of bite size achievable learning pacs. This will be supplemented by software and video components that become the teacher, chalkboard, and textbook in a one on one pupil teacher interactive mode. Each child has interactive tecnology that takes him via the subject for a visual analysis of details, visual display, and explanation for thorough learning experience, immediate feedback, and exam through computer software designed to enhance the learning process, measure real learning progress, and protect the child from cheating himself out of learning by required repeat of questionable results. Built in safety nets are repetitious complements of text presentation from video and computer resources, learning activities, check-ups, reviews, self test, and final unit monitored examinations. In a conventional classroom, time is the constant and learning is the variable. Global Educational Reform makes learning the constant and time the variable. The learning process is completly individualized, and there is no advancement without learning.

III. «...21st Century Education Reform through the application of values to develop individual character.» Modern education is fascinated with the mind of man and its potential for good in the search for the best human values. This is often referred to as «humanism». The 20th century has exhalted the concept of man to a position of deity and relegated the reality of a creator God of infinite and absolute character and characteristics to the realm of superstition. Human experience teaches us that man's relative capabilities tend to degenerate into self-centered and self-destructive activity unless the individual is constrained through a sense of ultimate accountability to a system and personality of absolute reality to which he ultimately must give an accounting. This basis of «absolute» reality represents a first cause which gives explanation to the question of cosmics «beginning», universal consistent principle, natural law, and scientific foundations for material substeance, the process of time. Principles can only come from a base of absolutes and character can only be a

reflection of ideal character which must presuppose an infinitite ideal source: thus the Biblical concept of god. This «absolute realitu» is the highest expression of academic quality of life and the source of all great lasting local, national, and international reform in the history of mankind. This provider the greatest source of presuppositions and values for academic learning. Education if LIFE. It is the communication of life from the living to the living: from generation to generation. And the highest quality of presupposition and values are found in this absolute reality: the living God revealed in «Biblical revelation» -the primary and only lasting foundation for educational reform.

IV. «...21st Century Educational Reform through the internationalization of curriculum». Through the evolution of transportation and communications into the computer age the planet is shrinking and developing into the global village. Hemisphere and international trade agreements are critical to economic survival, and nuclear war must be avoided. An international mentality is the most desirable objective for education elite on every continent. One of the major global trends in education is the internationalization of content, language and academic objectives.

V. «21st Century Educational Reform through bilingual education.» English has become the international language of business and technology. In order to function most effectively and efficiently in the field of commerce and technology on a national and international basis, it is increasingly necessary to possess not only the local language skills but to have a linguistic skill in the English language. This will be necessary for the first half of the 21st Century and possibly indefinitely.

These five principles state our position on the «Activisation of Creative Abilities of Students as the Strategi of the Modern Conception of Education» It is clearly a statement of the

global trends in education now shaping the academic landscape. These are indeed the format of the Shool of Tomorrow program, now in its 25th year, whish has spread to over 7,000 shools in 110 nations. It is not just a textbook theory but is being field tested even now in ower 100 government shools in 14 different nations under contract with the School of Tomorrow to implement this program of educational reform.

**Рагачова Л.М.,**
дацэнт

## ДЫЯЛОГ ЯК СРОДАК РАЗВІЦЦЯ ТВОРЧЫХ ЯКАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Арыентацыя сучаснага грамадства на стварэнне навучальных сістэм, якія маюць сваёй мэтай развіцце творчых здольнасцей асобы,— гэта заканамерны адказ на складаны і супярэчлівы працэс развіцця чалавецтва на мяжы XX і XXI стагоддзяў. Глабальныя праблемы, якія паўсталі перад сусветным супольніцтвам, у значнай ступені закранулі кожнага чалавека, паставілі яго перад неабходнасцю штодзённа вырашаць нестандартныя задачы, знаходзіць шляхі гарманізацыі ўзаемаадносін чалавека і грамадства, чалавека і прыроды. Гэта патрабуе гатоўнасці кожнага члена супольніцтва да мабілізацыі свайго творчага патэнцыялу. У сувязі з гэтым перад кожным педагогам паўстае актуальная задача - максімальна садзейнічаць фарміраванню творчых здольнасцей студэнтаў, узвышаць у іх свядомасці значнасць і каштоўнасць творчай дзейнасці для самарэалізацыі ў будучым прафесійным і грамадскім жыцці.

Заахвочванне студэнтаў паўсядзённым творчым працэсам патрабуе стварэння шэрага арганізацыйных і метадычных умоў, а таксама выкарыстання актыўных форм дзейнасці ў час заняткаў. Адной з вызначальных педагагічных умоў, якія складаюць неабходную атмасферу для творчасці студэнтаў, з'яўляецца свабода выказвання сваіх думак, упэўненасць у тым, што нестандартны адказ не выклікае негатыўнай рэакцыі ў студэнтаў і педагога.

Менавіта такія абставіны ствараюцца, калі зносіны педагога і студэнтаў носяць характар дыялога, а не маналагічнага дыктату. Дыялог як форма вуснай мовы, размова дзвюх або некалькіх асоб заўсёды выступае як дэмакратычная форма зносін і ўзнікае тады, калі ўдзельнікі дыскусіі жадаюць прыйсці да ўзаемаразумення і высвятлення агульнай пазіцыі. На наш погляд, дадзеная акалічнасць з'яўляецца адным з найбольш прывабных момантаў, бо на першы план выступае гуманістычная накіраванасць такой формы зносін. У працэсе дыялога акрэсліваецца мноства нюансаў, супярэчнасцей (сутыкненне поглядаў, ацэнак, аргументаў удзельнікаў, устанаўленне неадпаведнасці паміж тэорыяй і практыкай і інш.), а іх вырашэнне вядзе ўдзельнікаў дыялога да больш глыбокага і цэласнага разумення прадмета абмеркавання. Такая работа становіцца для студэнтаў больш прывабнай, але і больш складанай, таму што дыялог патрабуе доказальнасці, аргументаванасці выказваемых пазіцый у значна большай меры, чым маналог, асабліва калі апошні заснаваны на рэпрадуктыўным пераказе падручніка. Дыялог таксама прадугледжвае дыялектычны падыход да аналізу той ці іншай з'явы ці факта і забяспечвае, такім чынам, прастору для творчага мыслення студэнтаў. Безумоўна, час, які патрэбен для такога асэнсавання праблемы, будзе больш аб'ёмным, але і засваенне матэрыялу (а галоўнае, навучанне творчай дзейнасці) стане больш выніковым.

Неабходна падкрэсліць, што дыялогавая форма правядзення навучальных заняткаў прад'яўляе больш высокія патрабаванні і да самога педагога. Яму неабходна пастаянна быць дырыжорам дыскусіі, умела накіроўваць яе ў рэчышча вывучэння азначанай праблемы. Для гэтага патрэбна крапатлівая папярэдняя работа: абдумванне варыянтаў магчымых адказаў студэнтаў, фармулёўка дадатковых пытанняў, назапашванне шэрага канкрэтных прыкладаў вырашэння адпаведнай праблемы. Натуральна, што такая работа пашырае прафесійную кампетэнцыю педагога,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ